# Мовазнаўства

В. М. КАРЧАГІНА

## ПОСТФІКСАЦЫЯ ЯК СРОДАК УТВАРЭННЯ АДЫМЕННЫХ ДЗЕЯСЛОВАЎ

Утварэнне адыменных бяспрэфіксных зваротных дзеясловаў адбываецца ад асноў назоўнікаў і прыметнікаў пры дапамозе постфікса *-ся* і пэўных дзеяслоўных асноваўтваральных суфіксаў (*брат-братацца, корань-караніцца, куст-кусціцца, позні-пазніцца, храбры-храбрыцца* і інш.). Колькасць дзеясловаў, утвораных такім шляхам, у параўнанні з аддзеяслоўнымі зваротнымі дзеясловамі ў сучаснай беларускай мове нешматлікая (намі зафіксавана толькі 78 адыменных дзеясловаў). Тым не менш можна з поўным правам сцвярджаць, што ўтварэнне зваротных дзеясловаў ад іменных асноў у сучаснай беларускай мове з'яўляецца жывым і прадуктыўным працэсам. Пра гэта сведчыць наяўнасць вялікай колькасці такіх дзеясловаў, якія характэрныя толькі для беларускай мовы: *купчасціцца, маркоціцца, прамяніцца, фанабэрыцца, цьміцца, цяніцца, ясніцца* і інш. Гэтыя зваротныя дзеясловы не адзначаны слоўнікам рускай і ўкраінскай моў, хоць асобныя назоўнікі, на базе якіх утвораны пералічаныя дзеясловы, ужываюцца ў гэтых мовах. Прадуктыўнасць адзначанага спосабу ўтварэння дзеясловаў пацвярджае таксама індывідуальная словатворчасць сучасных беларускіх пісьменнікаў: Ты (балгарка) не народзіш недаўярка, Табой *славяняцца* вякі (Р. Барадулін. Амплітуда смеласці). *Вараняцца* раскрыллі скіб стуманелага ворыва (там жа). Хай *шчодрыцца* сяўба (Р. Барадулін. Спадчына). *Сузорыцца* кмен пад страхою (Р. Барадулін. Марыя Рыгораўна). *Пакоіцца* месяца жоўтае кола над даляглядам (Д. Бічэль-Загнетава. Абнаўленне). *Зорыцца* акно бацькоўскай хаты (С. Законнікаў. Хата). І жыцця расхінуўся абрус. Пра мяне *журбоціцца* маці (С. Законннікаў. Тры абліччы). А там пачнуць *прышчыцца* пупышкі дрэў, выклюнуцца маладыя, яшчэ клейкія лісткі, і тады пачнецца ўжо сама вясна (Р. Сабаленка. Незамужняя ўдава) і г. д.

Пераважная большасць адыменных зваротных дзеясловаў у сучаснай беларускай мове суадносіцца па свайму значэнню і ўтварэнню з назоўнікамі (так утвораны 60 дзеясловаў з усіх 78 зафіксаваных намі дзеясловаў разглядаемага тыпу): *адвага — адважыцца, бог — бажыцца, бугор — бугрыцца, гняздо — гняздзіцца, гонар — ганарыцца, жаль — жаліцца, змяя — змяіцца, клопат — клапаціцца, клубы — клубіцца, колас — каласіцца, краса — красавацца, нуда — нудзіцца, парася — парасіцца, сіла — сіліцца, сляза — слязіцца, умова — умовіцца, цацка — цацкацца, цяля — цяліцца* і інш.

Постфікс *-ся* можа ўтвараць дзеясловы не толькі ад спрадвечна беларускіх, але і запазычаных асноў. Напрыклад, ад асновы назоўніка *атрафія* (грэч. atrophe) утвараецца з дапамогай *-ся* і суфікса *-ірава-* дзея-

слоў *атрафіравацца:* **Гарлахвацкі.** Два крайнія (пальцы) сталі паступова *атрафіравацца* (К. Крапіва. Хто смяецца апошнім). Па такой жа схеме ўтворан дзеяслоў *гіпертрафіравацца* ад асновы назоўніка *гіпертрафія* (грэч. hyper+trophe). Утварэнне дзеясловаў з дапамогай постфікса *-ся* і дзеяслоўных суфіксаў ад запазычаных асноў адбываецца па тых жа ўзорах, па якіх утвараюцца дзеясловы ад спрадвечных асноў. Постфікс *-ся* як адзін з прадуктыўных словаўтваральных сродкаў уцягвае запазычаныя словы ў агульную сістэму словаўтварэння.

Характэрнай асаблівасцю постфікса *-ся* як словаўтваральнага элемента з'яўляецца «адушаўленне» адпаведных вытворных. Большасць зваротных дзеясловаў, утвораных ад іменных асноў, мае кола значэнняў, звязаных з адушаўлёным дзеючым суб'ектам. Яны выражаюць стан, дзеянне, імкненне і ўзаемаадносіны адушаўлёнай дзеючай асобы: *бажыцца, братацца, бычыцца, ганарыцца, клапаціцца, ленавацца, парасіцца, стараніцца, цяліцца* і інш.

Можна вызначыць наступныя лексіка-граматычныя групы такіх дзеясловаў.

1. Дзеясловы са значэннем «рабіць, весці сябе падобна таму, хто названы (што названа) матывуючым імем». Гэтыя дзеясловы ўтвораны ад назваў жывых істот. Сэнсавая сувязь паміж дзеясловам і назоўнікам з'яўляецца ўскоснай. Напрыклад, *братацца — брат, бычыцца — бык, нявесціцца — нявеста, сабачыцца* — (разм. груб. сварыцца, лаяцца) — *сабака:* Натоўп сабраўся... Крыкі... Аб чым там? *Братаюцца* ці б'юцца? (А. Макаёнак. Кашмар). Другому падшыванцу Трахім і сапраўды накруціў бы вушы, а гэтага ён толькі страшыць, не хоча з суседам *сабачыцца* (К. Крапіва. Мядзведзічы).

2. Дзеясловы са значэннем «знаходзіцца ў такім стане або рабіць тое, што выражана ў аснове назоўніка». Утвараюцца ад назоўнікаў з адцягненым значэннем. Такія зваротныя дзеясловы цесна звязаны па сэнсу з назоўнікамі, ад якіх утвораны: *адважыцца — адвага, ганарыцца — гонар, жаліцца — жаль, ляніцца* (ленавацца) — *лень* (*ленасць*), *здзекавацца — здзек, сіліцца —сіла* і інш.

І небу *жаліцца* жалейка, Заступніца адна за ўсіх (Р. Барадулін. Рачулка вуліцы Купалы). Восеньскі дзень *слязіўся* агіднай імжакай (Р. Сабаленка. Іду ў жыццё).

3. Дзеясловы, утвораныя ад назвы канкрэтных прадметаў. Абазначаюць унутраныя працэсы, у выніку якіх утвараецца прадмет. Яны цесна звязаны ў сэнсавых адносінах з матывуючым імем: *каласіцца — колас, караніцца — корань, гняздзіцца — гняздо, руніцца — рунь* і інш. Во яно дзе *гнездзіцца,* зло! На яхце (А. Макаёнак. Кашмар). Шумяць вякі зялёна, Бо глыбока *карэняцца* Скарынавы сляды (Р. Барадулін. Скарынавы сляды).

4. Дзеясловы, утвораныя на падставе выдзялення якаснай прыметы (формы, памеру, якасці) прадмета: *бугрыцца — бугор, клубіцца — клубы, кусціцца — куст, прамяніцца — прамень* і інш. *Клубяцца* шызыя астаткі грозных хмар (М. Багдановіч. Варажба). Ярына *кусцілася* на поўнае дыханне (Д. Бічэль-Загнетава. Вясна).

Амаль усе дзеясловы, адзначаныя ў выдзеленых вышэй групах, абазначаюць працэсуальныя ўласцівасці. Назоўнікі, якімі матывуюцца зваротныя адыменныя дзеясловы, не аднародныя ў семантычных адносінах. Адны з іх абазначаюць асоб (*брат, дзіця, кум, нявеста*), другія — назвы жывёл (*бык, парася, сабака, цяля*), трэція — назвы неадушаўлёных прадметаў (*бугор, гняздо, колас, корань, куст, рунь, сляза, стол*), чацвёртыя — розныя абстрактныя паняцці (*адвага, гонар, жаль, клопат, намер, нуда, сіла, умова, фанабэрыя*).

Ад зборных назоўнікаў утварэнне зваротных дзеясловаў з'яўляецца непрадуктыўным. Можна адзначыць хіба толькі адзін дзеяслоў *тоўпіцца,* які ўтворан ад старажытнага назоўніка *тълпа* (у сучаснай беларускай мове — *натоўп*). Спалучаецца гэты дзеяслоў з адушаўлёным суб'ектам і даволі шырока ўжываецца ў сучаснай мове: Ля моста ўнізе, ля самай

вады і на разбуранай колішнім выбухам насыпцы, завіхаўся дзесятак людзей, што *тоўпіліся* па той бок на дарозе... (В. Быкаў. Знак бяды).

У параўнанні з назоўнікамі прыметнікі значна радзей выкарыстоўваюцца для ўтварэння зваротных дзеясловаў. Група адпрыметнікавых зваротных дзеясловаў зусім нешматлікая (з 78 зафіксаваных адыменных зваротных дзеясловаў толькі 18 адпрыметнікавыя). Як сведчыць фактычны матэрыял, зваротныя дзеясловы (ды і іншыя дзеясловы наогул) утвараюцца толькі ад якасных прыметнікаў, таму што гэтыя прыметнікі абазначаюць пэўныя ўнутраныя пастаянныя ўласцівасці прадмета, якія могуць быць працэсуальнымі (утварэнне пэўнай якасці можа паказвацца як працэс, выражаны дзеясловам): *вясёлы — весяліць — весяліцца, радасны — радаваць — радавацца, позні — пазніцца, храбры — храбрыцца.*

Такой уласцівасці пазбаўлены адносныя, а таксама прыналежныя прыметнікі. Па характару выражэння прыметы яны наогул не могуць служыць базай для ўтварэнняў дзеясловаў на *-ся.*

Дзеясловы, утвораныя ад якасных прыметнікаў з дапамогай постфікса *-ся* і дзеяслоўнага суфікса, абазначаюць якасць як актыўную прымету. Звычайна слова з якасным значэннем (прыметнік) з'яўляецца азначэннем імя. Але якасць можа перадавацца ў мове і як актыўная прымета. Гэта адбываецца тады, калі ад асновы якаснага прыметніка ўтвараецца дзеяслоў: *кучаравыя валасы — валасы кучаравяцца, скупы чалавек — чалавек скупіцца.* Такім чынам, якасць пасіўна-азначальнага значэння ў прыметнікавых асновах набывае ў дзеяслоўных формах актыўна-прэдыкатыўнае значэнне.

Ад якасных прыметнікаў зваротныя дзеясловы ўтвараюцца на падставе той якасці, якая выражана ў аснове прыметніка: *высокі — высіцца, бедны — бедніцца, гарачы — гарачыцца, дзікі — дзічыцца, здаровы — здароўкацца, кволы — кволіцца, купчасты — купчасціцца, любы — любавацца, позні — пазніцца, тугі — тужыцца, чужы — чужацца* і інш. Па той бок *высіўся* навідавоку ладны гаёк (В. Быкаў. Знак бяды). А ён (Архіп) *бедніцца*, ведае, што старшыня сваяк — не зачэпіць (Р. Сабаленка. Іду ў жыццё). Чалавек ён не вельмі дужага здароўя, але ж ніколі і ні на што не *кволіўся* (там жа). Можна б было павольна, спакваля ісці, *любавацца* хараством лесу ў зімовым убранні (там жа). Першыя хрыпла *здароўкаліся* Дзвярыны з сонцам шторaніцы (Р. Барадулін. Ода дзвярынам). Арла кіпцюрастага Крылы даволі Распасцерціся *тужыліся* Над востравам (Р. Барадулін. Вечалле). Калі ў бары прымаецца ляшчына, Атожылку *купчасціцца* пара (там жа). Не *скупіцца* на радасць зіма (С. Законнікаў. Першы снег).

Трэба адзначыць, што ўсе бяспрэфіксныя зваротныя дзеясловы, утвораныя ад назоўнікаў і прыметнікаў, маюць незакончанае трыванне. Закончанае трыванне ўтвараецца ад некаторых з іх пры дапамозе адпаведных прэфіксаў. Напрыклад: *расхрабрыцца, налюбавацца, паздароўкацца, пабратацца, здзяцініцца* і інш.

Пры ўтварэнні адыменных зваротных дзеясловаў у асобных выпадках адбываюцца розныя марфаналагічныя працэсы: рэгулярнае чаргаванне заднеязычных з шыпячымі (*адвага — адважыцца, бог — бажыцца, снег — сняжыцца, дзікі — дзічыцца, рука —ручацца, сабака — сабачыцца*), змена націску (у адных выпадках націск захоўвае сваё месца: *здарóвы — здарóўкацца, жаль — жáліцца, купчáсты — купчáсціцца* і інш., у другіх — перамяшчаецца на суфікс зваротнага дзеяслова: *гóнар — ганарыцца, пóзні — пазніцца, прамéнь — прамяніцца, стол — сталавáцца* і інш.).

Адыменныя зваротныя бяспрэфіксныя дзеясловы ўтвараюцца па ўзору прадуктыўных марфалагічных класаў. Як паказвае фактычны матэрыял, адыменныя зваротныя дзеясловы ўтвараюцца па мадэлях дзеясловаў I, III, IV прадуктыўных класаў [1]. Найбольш прадуктыўнымі з'яўляюцца дзеясловы, афармленыя па ўзору дзеясловаў IV прадуктыўнага класа, г. зн. утвораных з дапамогай постфікса *-ся* і асноваўтваральных

суфіксаў *-і-*, *-ы-*: *адважыцца, бедніцца, высіцца, ганарыцца, дзічыцца, жаліцца, караніцца, скупіцца, тужыцца, ягніцца* і інш. (так утвораны 59 дзеясловаў з усіх 78 зафіксаваных намі адыменных дзеясловаў). Нязначная колькасць зваротных дзеясловаў адыменнага паходжання ўтвараецца па ўзорах I і III прадуктыўных класаў (усяго 18): *здзекавацца, красавацца, рубцавацца, харчавацца* (III), *ручацца, цацкацца* (I).

Наш матэрыял дае падставы сцвярджаць, што ў сістэме дзеяслова сучаснай беларускай мовы постфікс *-ся* з'яўляецца адным з тых прадуктыўных сродкаў, пры дапамозе якіх адбываецца ўтварэнне дзеясловаў ад назоўнікаў і прыметнікаў.

[1] Гл.: Беларуская граматыка.— Мінск, 1985.— Ч. 1.— С. 166.

В. П. ТРАЙКОЎСКАЯ

## ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ СІНОНІМАЎ У БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ ТКАЦТВА

Багатая сінанімія лексічных сродкаў, якія адносяцца да назваў прадметаў у той ці іншай сферы чалавечай дзейнасці, сведчыць аб вялікай ролі і важнасці гэтай дзейнасці для людзей і, што істотна падкрэсліць, аб дэталёвай, дакладнай распрацоўцы і дастаткова тонкай нюансіроўцы паняццяў, якія выкарыстоўваюцца ў ёй. У адрозненне ад тэрмінасістэм навукі і вытворчасці, што ў большасці сваёй свядома ствараюцца спецыялістамі і ў выніку гэтага маюць мінімум сінонімаў, народная тэрміналогія складалася стыхійна на працягу доўгага часу і таму ў ёй, як і ў іншых тэматычных аб'яднаннях лексікі жывой гутарковай мовы, шырока распаўсюджана сінанімія.

У беларускай народнай тэрміналогіі дамашняга ткацтва таксама адзначаецца даволі вялікая колькасць слоў і словазлучэнняў, якія не супадаюць па форме, але істотна не адрозніваюцца сваімі значэннямі. Падобныя словы і словазлучэнні пры наяўнасці больш ці менш відавочных семантычных адценняў могуць разглядацца як сінонімы. Такія сінонімы ўтвараюць неаднолькавыя па свайму колькаснаму складу рады, якія ўключаюць ад дзвюх да некалькіх адзінак. Колькасць іх залежыць ад ролі і месца той ці іншай рэаліі ў адпаведным відзе дамашняга рамяства. Чым важнейшая для рамяства рэч, тым, як правіла, больш слоў выкарыстоўваецца для яе намінацыі. Напрыклад, словы *ручнік, скарач, выціральнік, трапкачык* абазначаюць прадметы аднаго і таго ж роду — кавалак тканіны, спецыяльна прызначаны для выцірання твару, рук, цела ці пасуды. Але кожнае з гэтых слоў, называючы ўвогуле адзін і той жа прадмет, некалькі дыферэнцыруе яго ў залежнасці ад функцыянальнага прызначэння. Так, словы *ручнік, выціральнік* часцей за ўсё абазначаюць ручнік для рук і твару, *скарач, трапкачык* — ручнік для пасуды. Словы *жывіца* і *шнурок* абазначаюць вяроўку, якую выкарыстоўваюць для мацавання дэталей ткацкага станка. Гэтыя словы адрозніваюцца сферай выкарыстання: *шнурок* ужываецца і ў літаратурнай мове, і ў народнай тэрміналогіі, а *жывіца* — пераважна ў апошняй.

Паколькі ў народнай тэрміналогіі адсутнічае строгая дыферэнцыяцыя назваў рэчаў, падобных па свайму характару (знешняму выгляду, прызначэнню і да т. п.), то ўсе такія назвы звязваюцца пэўнымі сінанімічнымі адносінамі. Апрача дыферэнцыяцыі па відавочных семантычных прыметах, сінонімы ў беларускай народнай тэрміналогіі ткацтва адрозніваюцца таксама на аснове ўліку, з аднаго боку, іх знешніх фармальных уласцівасцей, і з другога — унутранай формы. Сярод фармальных уласцівасцей адрозніваюцца граматычныя і неграматычныя. Да неграматычных уласцівасцей адносяцца ўсе тыя знешнія фармальныя ўласцівасці плана выражэння сінонімаў, якія не пападаюць у разрад граматыч-